СЕННЯ СПАЎНЯЕЦЦА 50 ГОД З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ВЯЧЭСЛАВА МІХАЙЛАВІЧА МОЛАТАВА

Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 56 (125) СУБОТА 9 САКАВІКА 1940 г.

Цана 10 капеек

ВЕРНАМУ САРАТНІКУ ЛЕНІНА і СТАЛІНА —

ВЯЧЭСЛАВУ МІХАЙЛАВІЧУ МОЛАТАВУ

Цэнтральны Камітэт большэвіцкай партыі горача вітае цябе, вернага саратніка Леніна і Сталіна, кіраўніка совецкага ўрада—з днём твайго 50-годдзя.

Усё сваё свядомае жыццё ты безупынна служыш справе рабочага класа, справе комунізма ў якасці выдатнага дзеяча і правадыра большэвіцкай партыі. У чорныя годы рэакцыі пасля паражэння рэволюцыі 1905 —1907 гг., у годы ўздыму рабочага руху, у эпоху «Звезды» і «Правды», у агні першай сусветнай імперыялістычнай вайны—ты заўсёды высока трымаў сцяг большэвізма, нястомна змагаючыся за дыктатуру пролетарыята ў нашай краіне. Як член Петраградскага Ваенна-Рэволюцыйнага Камітэта, ты правёў вялікую рэволюцыйна-большэвіцкую работу ў кастрычніку 1917 года. Сваёй работай у якасці кіраўніка партыйных арганізацый Данбаса, Украіны, Масквы, у якасці сакратара ЦК ВКП(б), сваёй шматгадовай слаўнай работай на пасту главы совецкага ўрада ты заслужыў гарачую любоў і велізарнае паважанне партыі і працоўных Совецкага Саюза.

Як адзін з віднейшых правадыроў большэвіцкай партыі, як буйнейшы арганізатар соцыялістычнай эканомікі і новай, комуністычнай культуры, ты ўвасобіў у сабе лепшыя якасці палітычнага дзеяча ленінска-сталінскага тыпу. Ты заўсёды вёў і вядзеш паслядоўную барацьбу за ідэі марксізма-ленінізма, няўхільна адстойваючы лінію партыі супроць ворагаў партыі і совецкага народа, супроць трацкістаў, зіноўеўцаў, бухарынцаў і іншых агентаў буржуазіі.

Тваёй энергіі, тваёй нястомнай рабоце на пасту Старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР краіна соцыялізма ў многім абавязана сваімі поспехамі і перамогамі. У сваіх вусных і друкаваных выступленнях перад партыяй і краінай ты абагульняеш гіганцкі вопыт вялікай работы па стварэнню комуністычнага грамадства.

Жадаем табе, наш дарагі друг і таварыш, ад усёй душы многіх, многіх год здароўя і далейшай плённай работы на дабро нашай партыі, на дабро нашай радзімы, на дабро комунізма.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (БОЛЬШЭВІКОЎ).

ВЯЧЭСЛАЎ МІХАЙЛАВІЧ МОЛАТАЎ

Сёння спаўняецца 50 год з дня нараджэння бліжэйшага саратніка таварыша Сталіна, главы совецкага ўрада, віднейшага дзеяча большэвіцкай партыі, члена Палітбюро ЦК ВКП(б) Вячэслава Міхайлавіча Молатава.

З юных год таварыш Молатаў пачаў сваю рэволюцыйную дзейнасць, і калі яму споўнілася 16 год, ён уступіў у рады большэвіцкай партыі. Царскія апрычнікі бачылі ў асобе таварыша Молатава растучага рэволюцыйнага дзеяча, і 19-гадовага Вячэслава Міхайлавіча арыштоўваюць і высылаюць у Валагодскую губерню. Рэпрэсіі царскага ўрада яшчэ больш загартоўваюць маладога рэволюцыянера. Будучы ў ссылцы, ён вывучае творы класікаў марксізма, рыхтуе сябе да будучых схватак з ненавісным царскім урадам, з апартуністычнымі антыленінскімі партыямі, якія пранікалі ў рабочы рух. Жандармскія ішчэйкі, якія пільна наглядалі за таварышом Молатавым у час яго ссылкі, у сваіх даносах пісалі, што ён «вызначаецца веданнем соцыял-дэмакратычнай праграмы і літаратуры і з'яўляецца сур'ёзным арганізатарам».

Пасля ссылкі з 1911 да 1917 года таварыш Молатаў працуе ў Пецербургу, дзе стварае большэвіцкія арганізацыі сярод студэнцтва, затым працуе ў большэвіцкай газеце «Звезда», прымае актыўны ўдзел у стварэнні большэвіцкай штодзённай газеты «Правда» і працуе ў ёй у якасці аднаго з яе кіраўнікоў. У 1914 г. таварыш Молатаў пераязджае ў Маскву. Ён з усёй энергіяй працуе над стварэннем маскоўскай большэвіцкай арганізацыі. Царская ахранка яго зноў арыштоўвае, але праз год ён уцякае з ссылкі і зноў бярэцца за актыўную партыйную работу.

Таварышу Молатаву належыць вялікая роля ў падрыхтоўцы і кіраўніцтве кастрычніцкім паўстаннем. Усе паследуючыя годы ён працуе на адказнай партыйнай рабоце. У 1926 г ён выбіраецца членам Палітбюро ЦК ВКП(б). X партыйны з'езд выбірае таварыша Молатава сакратаром ЦК ВКП(б), і на гэтым пасту ён працаваў да 1930 года.

У 1930 годзе, калі наша краіна разгарнула соцыялістычнае наступленне па ўсім фронце, калі трэба было перамагчы цяжкасці нашага бурнага росту, калі трэба было разбіць супраціўленне капіталістычных элементаў, таварыш Молатаў назначаецца главой совецкага ўрада—старшынёй Совета Народных Камісараў СССР. 10 год таварыш Молатаў стаіць на чале першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы. Ён, як верны сын партыі, як вучань Леніна і Сталіна, аддае ўсе свае сілы, увесь свой арганізатарскі талент справе ўмацавання Совецкага Саюза, справе пабудовы комуністычнага грамадства. За гэтыя 10 год пераўтварылася наша краіна, створана магутная, соцыялістычная індустрыя. Вырас і ўмацаваўся калгасны лад. Расцвіла культура, навука і мастацтва. Устанавілася небывалая дружба народаў Совецкага Саюза. Працоўныя масы як ніколі згуртаваны вакол сваёй партыі, вакол свайго правадыра таварыша Сталіна. Гэта дало магчымасць таварышу Молатаву заявіць перад усім светам у дакладзе, прысвечаным 20-годдзю Кастрычніцкай рэволюцыі, наступныя гістарычныя словы:

«У нас стала прывычным, што ворагаў комуністычнай партыі і совецкай улады лічаць ворагамі народа... Гэта азначае, што ў нашай краіне стварылася небывалае раней унутранае маральнае і палітычнае адзінства народаў, маральнае і палітычнае адзінства соцыялістычнага грамадства. Такога адзінства народаў не ведала і не ведае ні адна капіталістычная краіна».

Велізарныя поспехі Совецкага Саюза не даюць спакою імперыялістычным драпежнікам. Апошнія годы адзначыліся радам правакацый супроць нашай краіны. Англійскія і французскія падпальшчыкі вайны ствараюць на нашых граніцах плацдармы для ваеннага нападу на СССР. У 1939 годзе міжнародная абстаноўка абвастрылася да абмежавання. Разгараецца пажар другой імперыялістычнай вайны. СССР знаходзіцца ў капіталістычным акружэнні. Нашы ўнутраныя поспехі цесна звязаны з поспехамі знешняй палітыкі. Неабходны быў чалавек, які-б цвёрдай рукой праводзіў сталінскую знешнюю палітыку, які-б не даў уцягнуць СССР у вайну. У гэты перыяд таварыш Молатаў назначаецца па сумяшчэнню народным камісарам замежных спраў СССР.

Яшчэ няма года, як Вячэслаў Міхайлавіч працуе не гэтым пасту. За гэты перыяд знешняя палітыка СССР азнаменавалася буйнейшымі поспехамі. Сарван план англійскіх і французскіх імперыялістаў аб ваеннай сутычцы народаў Германіі і СССР. Паміж СССР і Германіяй створаны прыяцельскія палітычныя і гаспадарскія адносіны. Ліквідавана ўродлівая польская дзяржава — плацдарм, адкуль англа-французскія разбойнікі рыхтавалі напад на СССР. Па загаду совецкага ўрада доблесная Чырвоная Армія вызваліла 13 мільёнаў сваіх аднакроўных братоў украінцаў і беларусаў з-пад панскага прыгнёту і прыняла іх у сваю совецкую сям'ю. СССР умацаваў свае граніцы з боку Балтыйскага мора заключэннем дагавораў аб узаемадапамозе з Латвіяй, Эстоніяй і Літвой.

У мэтах аховы граніц Совецкага Саюза і забеспячэння безапаснасці найвялікшага горада Ленінграда СССР прапанаваў заключыць такі-ж дагавор з Фінляндыяй. Замест гэтага ворагі фінскага народа і народаў СССР — шайка бандытаў Манергейма-Танера, па ўказцы сваіх гаспадароў з Англіі і Францыі, пачалі ліхаманкава рыхтавацца да вайны супроць СССР. Манергеймаўскія банды асмеліліся праліць кроў нашых байцоў, абстраляўшы іх з сваёй тэрыторыі. Па заданню свайго ўрада доблесная Чырвоная Армія выступіла на абарону сваіх граніц ля Ленінграда. Манергеймаўскія банды церпяць буйныя паражэнні і будуць разгромлены да канца. Зрываецца яшчэ адзін план англійскіх і французскіх падпальшчыкаў вайны. Разбураецца яшчэ адзін плацдарм, адкуль рыхтаваўся напад на СССР.

Забяспечыўшы безапаснасць сваёй краіны, СССР па дагавору з народным урадам Фінляндыі змагаецца за вызваленне фінскага народа.

Народы СССР горача любяць главу свайго ўрада Вячэслава Міхайлавіча Молатава. Пры выбарах у Вярхоўны Совет СССР 1192 агульных сходы працоўных вылучылі яго кандыдатуру. Таварыш Молатаў з'яўляецца дэпутатам Вярхоўных Советаў усіх саюзных рэспублік. Сотні сходаў працоўных нашай вобласці вылучылі кандыдатуру таварыша Молатава ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР ад заходніх абласцей БССР. У асобе таварыша Молатава народ бачыць аднаго з бліжэйшых саратнікаў правадыра народаў таварыша Сталіна, нястомнага змагара за перамогу працоўных і прыгнечаных народаў усяго свету.

Вызваленыя народы заходніх абласцей БССР жадаюць таварышу Молатаву доўгіх год работы на радасць працоўных, на страх ворагаў совецкага народа!

Старшыні Соўнаркома Саюза ССР Вячэславу Міхайлавічу Молатаву

Дарагі Вячэслаў Міхайлавіч!

Беластоцкі абласны камітэт КП(б) Беларусі горача вітае Вас, вернага вучня Леніна, бліжэйшага саратніка Сталіна, главу совецкага ўрада ў дзень Вашага слаўнага пяцідзесяцігоддзя.

З юных год Вы, Вячэслаў Міхайлавіч, уступілі на шлях рэволюцыйнай барацьбы і беззаветна служыце вялікай справе партыі, справе рабочага класа і ўсяго працоўнага народа. Вы з'яўляецеся адным з арганізатараў і кіраўнікоў Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, адным з арганізатараў совецкай улады і выдатным кіраўніком першай у свеце совецкай соцыялістычнай дзяржавы. Вы заўсёды вялі паслядоўную барацьбу за ідэі Маркса—Энгельса —Леніна —Сталіна, бязлітасна выкрывалі і грамілі ворагаў партыі і совецкага народа. З Вашым іменем звязаны перамогі вялікай партыі большэвікоў у галіне соцыялістычнай індустрыялізацыі і калектывізацыі нашай краіны.

Ваша гістарычная прамова 17 верасня натхніла доблесную Чырвоную Армію на выкананне вялікай справы вызвалення народаў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ад прыгнёту і самавольства памешчыкаў і капіталістаў панскай Польшчы.

Партыйная арганізацыя і працоўныя Беластоцкай вобласці, вітаючы Вас, таварыш Молатаў, у дзень Вашага пяцідзесяцігоддзя, жадаюць Вам доўгіх год жыцця і пленнай працы на радасць працоўных.

Няхай жыве непераможная партыя Леніна—Сталіна!

Няхай жыве глава совецкага ўрада Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў!

Няхай жыве наш дарагі, любімы правадыр, настаўнік і друг вялікі Сталін!

Беластоцкі абком КП(б)Б.

УКАЗ
Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

Аб ўзнагароджанні Старшыні Совета Народных Камісараў СССР таварыша Вячэслава Міхайлавіча Молатава ордэнам Леніна

За выдатныя заслугі ў справе арганізацыі большэвіцкай партыі, стварэння і ўмацавання Совецкай дзяржавы ўзнагародзіць Старшыню Совета Народных Камісараў СССР таварыша Вячэслава Міхайлавіча МОЛАТАВА, у дзень яго пяцідзесяцігоддзя—ордэнам Леніна.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
8 сакавіка 1940 г.

В. М. МОЛАТАЎ

(КАРОТКАЯ БІЯГРАФІЯ)

Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў (Скрабін) — старшыня Совета Народных Камісараў СССР, член Палітбюро ЦК ВКП(б) — нарадзіўся 9 сакавіка 1890 года ў слабадзе Кукарцы, Вяцкай губерні (цяпер горад Совецк, Кіраўскай вобласці), у сям'і служачага. У 1902 годзе тав. Молатаў паступіў у 1-е Казанскае рэальнае вучылішча. Ужо ў 1905 г. тав. Молатаў пачаў сваю рэволюцыйную дзейнасць, удзельнічаючы ў рэволюцыйных вучнёўскіх гуртках, на мітынгах і дэманстрацыях супроць царызма. У 1906 г. у Казані тав. Молатаў уступіў у партыю большэвікоў.

У 1909 г. тав. Молатаў быў арыштаван і высланы на 2 годы ў Валагодскую губерню. У ссылцы тав. Молатаў знаходзіўся спачатку ў горадзе Тоцьме і Сольвычагодску, а затым у Валагдзе. Знаходзячыся ў ссылцы, тав. Молатаў вёў актыўную нелегальную партыйную работу сярод чыгуначных рабочых, якія складалі ў Валагдзе галоўныя пролетарскія кадры. Партыйная арганізацыя Валагды, фактычна створаная тав. Молатавым, у 1910—1911 гг. значна ўзмацняе сваю дзейнасць, цвёрда праводзячы лінію большэвікоў. У час ссылкі тав. Молатаў вялікую ўвагу ўдзяляе вывучэнню твораў класікаў марксізма.

Па сканчэнні ссылкі, у чэрвені 1911 года, тав. Молатаў паступіў у Палітэхнічны інстытут у Пецербургу, дзе правёў вялікую работу па стварэнню большэвіцкіх студэнцкіх арганізацый, па згуртаванню рэволюцыйных кадраў студэнцтва. З 1912 года тав. Молатаў пачаў працаваць у большэвіцкай газеце «Звезда». Тав. Молатаў прымаў актыўны ўдзел у стварэнні большэвіцкай штодзённай газеты «Правда», увасходзіў у састаў рэдакцыі «Правды», змяшчаючы артыкулы пад псеўдонімам А. Рабін, В. Міхайлаў, А. Званаў. К гэтаму часу адносяцца першыя сустрэчы тав. Молатава з таварышам Сталіным, непасрэдна кіраваўшым стварэннем «Правды». Будучы сакратаром рэдакцыі і адным з кіраўнікоў «Правды», тав. Молатаў вёў перапіску з замежным цэнтрам большэвікоў і асабіста з В. І. Леніным.

У 1912 г. тав. Молатаў — член падпольнага Пецербургскага камітэта большэвікоў—вёў непрымірымую барацьбу з ліквідатарствам і другімі антыбольшэвіцкімі плынямі. За рэволюцыйную дзейнасць тав. Молатаў неаднаразова арыштоўваўся і высылаўся з Пецербурга.

У час першай імперыялістычнай вайны тав. Молатаў актыўна праводзіў большэвіцкую лінію па пытанню аб вайне, за ператварэнне вайны імперыялістычнай у вайну грамадзянскую. З восені 1914 года тав. Молатаў у Маскве вядзе ўпартую работу па стварэнню большэвіцкай Маскоўскай арганізацыі, разгромленай царскай ахранкай у пачатку імперыялістычнай вайны. У 1915 г. тав. Молатаў зноў быў арыштаван і выслан на 3 годы у Іркуцкую губерню (сяло Манзурка). У маі 1916 года тав. Молатаў бяжыць з ссылкі. Восенню гэтага года тав. Молатаў быў каапціраван у састаў Расійскага бюро ЦК большэвікоў.

У перыяд лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі тав. Молатаў — член Петраградскага камітэта большэвікоў, член Выканаўчага камітэта Петраградскага совета. Тав. Молатаў кіраваў аднаўленнем і выпускам газеты «Правда», прымаў актыўны ўдзел у работах красавіцкай партыйнай канферэнцыі і VI з'езда партыі.

У дні Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі тав. Молатаў — адзін з самых актыўных кіраўнікоў большэвікоў, працуючых непасрэдна пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна, член Ваенна-рэволюцыйнага камітэта, кіраваўшага паўстаннем у кастрычніцкія дні.

У пачатку 1918 г. тав. Молатаў быў вылучан на пост старшыні Совета Народнай Гаспадаркі Паўночнага раёна, у які ўваходзілі тады сем паўночных губерняў, у тым ліку Петраградская.

Летам 1919 г. тав. Молатаў быў назначан упаўнаважаным партыі і совецкага ўрада ў Паваложжа. З канца 1919 г. тав. Молатаў — старшыня Ніжагародскага губвыканкома, у верасні 1920 г. накіроўваецца ЦК партыі большэвікоў у Данбас і працуе як сакратар Данецкага губкома. На IX з'ездзе РКП(б) тав. Молатаў быў выбран кандыдатам у члены ЦК РКП(б).

З лістапада 1920 г. тав. Молатаў — сакратар ЦК КП(б) Украіны. У 1921 г., на X з'ездзе РКП(б), тав. Молатаў быў выбран членам ЦК РКП(б), а на пленуме ЦК — кандыдатам у члены Палітбюро, а з 1926 г. — членам Палітбюро ЦК ВКП(б). З X з'езда партыі да канца 1930 г. тав. Молатаў — сакратар ЦК ВКП(б). З снежня 1930 г. тав. Молатаў — старшыня Соўнаркома СССР. У 1939 г. тав. Молатаў быў назначан па сумяшчэнню Народным Камісарам замежных спраў СССР.

Верны вучань Леніна і бліжэйшы саратнік тав. Сталіна, тав. Молатаў з'яўляецца адным з выдатных кіраўнікоў большэвіцкай партыі і совецкай улады. У сваёй рабоце ў галіне партыйнага і совецкага будаўніцтва тав. Молатаў змагаецца за ўвасабленне ў жыццё ідэй марксізма-ленінізма, за пабудову комуністычнага грамадства ў нашай краіне, вядзе барацьбу супроць усіх ворагаў комуністычнай партыі і совецкага народа.

Тав. Молатаў — дэпутат Вярхоўнага Совета СССР і дэпутат Вярхоўных Советаў саюзных і аўтаномных совецкіх соцыялістычных рэспублік.

БУЙНЕЙШЫ ДЗЕЯЧ БОЛЬШЭВІЦКАЙ ПАРТЫІ

Таварышу Молатаву 50 год. З гэтых 50 год 35 год цалкам належаць рабочаму класу, барацьбе за справу якога таварыш Молатаў прысвяціў сябе з 15-гадовага ўзросту.

Юнаком уступіў таварыш Молатаў у рады большэвіцкаи партыі. Незгінаемай воляй, невычарпальнай энергіяй, верай у перамогу соцыялізма трэба было ўладаць чалавеку, які станавіўся ў годы праклятага царызма на шлях бясстрашнай рэволюцыйнай барацьбы, на які тав. Молатаў уступіў у 1906 г. яшчэ будучы вучнем рэальнага вучылішча.

У кнізе «Сталін» Анры Барбюс у некалькіх сціслых фразах даў выключна моцную характарыстыку старым большэвікам-падпольшчыкам, да катэгорыі якіх належыць тав. Молатаў. Барбюс пісаў:

«Рамясло падпольнага агітатара, прафесіянальнага рэволюцыянера, захапіўшае Сталіна, як і многіх другіх, — гэта цяжкае рамясло. Хто ўзяўся за яго, той па-за законам, за ім палюе ўвесь апарат дзяржавы, яго травіць паліцыя. Ён — здабыча цара і яго велізарнай, адкормленай, узброенай да зубоў многарукай зграі. Ён падобны ссыльнаму ў кароткім часовым водпуску, ён хаваецца, прынікаючы да зямлі, ён заўсёды павінен быць нагатове... Паяўляючыся то там, то тут, ён сее гнеў і запаляе розумы, а адзіны рычаг, якім ён павінен падняць народы, — гэта яго перакананне і яго голас.

Займешся гэтым рамяслом, і куды ні глянь—на гарызонце яскрава вырысоўваецца турма, Сібір ды віселіца. Гэтым рамяслом можа займацца не ўсякі» (**Анры Барбюс,** «Сталін», стар. 22—23).

Няўзгоды і лішэнні, бяссонніца і недаяданне, арышты і ссылкі, цяжкае жыццё нелегальнага рэволюцыянера — усё гэта ў поўнай меры адчуў і таз. Молатаў. Але праследванні царызма толькі загартавалі рэволюцыйную волю большэвіка. Яшчэ юнаком ён пападае ў турму, і час гэты, які тав. Молатаў вымушаны праводзіць удалячыні ад рабочых мас, ён выкарыстоўвае для вывучэння марксізма.

Дзевятнаццаці год яго ссылаюць у глухую тады Валагодскую губерню, але і тут тав. Молатаў не губляе ні мінуты каштоўнага часу. Ён стварае большэвіцкую арганізацыю, вядзе нелегальную работу сярод чыгуначнікаў.

Студэнт Пецербургскага палітэхнічнага інстытута, тав. Молатаў арганізуе рэволюцыйную вучнёўскую моладзь, працуе ў большэвіцкай газеце «Звезда», з'яўляецца адным з бліжэйшых памочнікаў таварыша Сталіна па арганізацыі і кіраўніцтву «Правдой», да голасу якой ужо тады—у 1912 годзе—прыслухоўваўся пролетарыят усёй Расіі.

Годы імперыялістычнай вайны. Большэвіцкія арганізацыі разгромлены. Тав. Молатава высочвае паліцыя, але не так лёгка знайсці яго, вопытнейшага канспіратара.

Ён аднаўляе большэвіцкія ячэйкі, выпускае пракламацыі супроць імперыялістычнай вайны, нясе ў масы запаляючыя словы большэвізма. Небяспекі вялікія, але ён іх па-майстэрску абыходзіць і па заданню партыі разгортвае велізарную па таму часу работу ў Петраградзе, у Маскве.

Царскім ішчэйкам удалося набрысці на след буйнейшага большэвіцкага дзеяча, арыштаваць і саслаць яго ў далёкую Усходнюю Сібір. Але не надоўга. Тав. Молатаў у скорасці ўцякае з ссылкі, і вось ён зноў у сталіцы, член Расійскага бюро ленінскага Цэнтральнага Камітэта, прызнаны кіраўнік петраградскага большэвіцкага падполля.

У лютаўскай рэволюцыі, якая звергнула ненавіснае самадзяржаўе, многа працы і арганізуючай сілы тав. Молатава, вернага вучня вялікіх правадыроў рабочага класа — Леніна і Сталіна.

Царызм звергнут. Тав. Молатаў аднаўляе ленінска - сталінскую «Правду», кіруе дзеяннямі салдацкіх арганізацый, якія пасылаюць сваіх дэпутатаў у Петраградскі совет, стварае большэвіцкія арганізацыі на заводах.

У гістарычныя дні Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі тав. Молатаў у штабе рэволюцыі, у Ваенна - Рэволюцыйным Камітэце, якім непасрэдна кіруе таварыш Сталін.

Тав. Молатаў пасля ўспамінаў аб сваёй рабоце ў Ваенна-Рэволюцыйным Камітэце. То былі першыя тыдні Вялікага Кастрычніка. «Мне здаецца, — успамінаў тав. Молатаў, — у гэтыя тыдні праз Ваенна-Рэволюцыйны Камітэт прайшлі не сотні, а тысячы дэлегацый і дзесяткі тысяч дэлегатаў, якія жадалі дакладна даведацца аб ходзе рэвалюцыі і аб дзеяннях Ваенна-Рэволюцыйнага Камітэта. Шукалі, перш за ўсё, праўды аб падзеях і непасрэднага ўяўлення аб новай уладзе». (**В. Молатаў.** «Часцічка работы ў Кастрычніцкія дні». «Правда», 7 лістапада 1925 г.).

Тав. Молатаў узначальваў агітацыйны аддзел Ваенна-Рэволюцыйнага Камітэта. З раніцы да ночы, не ведаючы адпачынку, ён прымаў велізарную колькасць людзей: рабочых, салдат, матросаў, сялян, — растлумачваў сэнс праходзячых падзей, забяспечваў іх літаратурай, рассылаў дэлегатаў ва ўсе канцы краіны, інспектырваў іх, настаўляў, як змагацца за совецкую ўладу, як несці ў масы праўдзівае слова аб соцыялістычнай рэволюцыі.

Пачалася грамадзянская вайна. Полчышчы белагвардзейцаў і інтэрвентаў акружылі Совецкую рэспубліку.

Трэба было ўжыць неймаверныя намаганні, каб адстаяць маладую рабоча-сялянскую дзяржаву.

Большэвіцкая партыя падняла народ на айчынную вайну супроць белагвардзейцаў і інтэрвентаў. Вораг быў моцны, добра ўзброены і забяспечаны. Трэба было бесперапынна забяспечваць Чырвоную Армію ўсім неабходным. Тав. Молатаў у гэты цяжкі для краіны час назначаецца партыяй на пост старшыні Совета Народнай Гаспадаркі Паўночнага раёна, які яднаў сем паўночных губерняў, у тым ліку і Петраградскую, самую прамысловую, а значыць і самую важную тады для народнай гаспадаркі.

Восень 1920 года. Трэба аднаўляць прамысловасць і транспарт, трэба ўдыхнуць жыццё ў пагасшыя заводы, фабрыкі, электрастанцыі. А для гэтага неабходна паліва, неабходзен вугаль. І партыя пераводзіць тав. Молатава ў Данбас сакратаром Данецкага губернскага камітэта партыі, а яшчэ праз некаторы час — на пост сакратара Цэнтральнага Камітэта КП(б) Украіны. Украіна тады азначала для нашай краіны хлеб і вугаль, і зразумела, чаму ЦК партыі намеціў Молатава главой украінскіх большэвікоў: партыя ведала яго цвёрдасць, бясстрашша, каласальную працаздольнасць, уменне ўнікаць і разбірацца ў самых складаных, заблытаных пытаннях; партыя ведала бязмежную адданасць Молатава справе партыі, яго крышталъную чэснасць, прынцыповасць, непрымірымасць да ворагаў.

Гэтыя якасці тав. Молатава—выдатнага палітычнага дзеяча ленінска-сталінскага тыпу — былі добра вядомы ўсёй партыі. Ленін пісаў аб Молатаве: «Асабіста мне вядомы стары партыйны работнік».

Пасля X з'езда партыі тав. Молатаў — сакратар Цэнтральнага Камітэта партыі. Дзесяць год ён прабыў на гэтым пасту—з 1921 да канца 1930 года. Гэта былі, бадай, самыя складаныя годы ў гісторыі нашай краіны: сканчэнне грамадзянскай вайны; пераход да новай эканамічнай палітыкі (нэп) і да аднаўлення народнай гаспадаркі; смерць Леніна; атака ворагаў партыі на ленінізм; сталінская індустрыялізацыя краіны; суцэльная калектывізацыя сельскай гаспадаркі і ліквідацыя кулацтва як класа.

Успомнім гэтыя годы, і мы лёгка ўявім сабе, якую сапраўды грандыёзную работу праробіў штаб большэвіцкай партыі і якая тытанічная работа лягла на плечы таварыша Сталіна пасля смерці Владзіміра Ільіча.

Усе шматгранныя пытанні партыйнага і дзяржаўнага будаўніцтва, грандыёзныя планы індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, разгром ворагаў народа, усе перамогі нашай радзімы звязаны з іменем вялікага прадаўжальніка справы Леніна, з іменем таварыша Сталіна. У гэтай барацьбе тав. Молатаў быў бліжэйшым саратнікам таварыша Сталіна.

З якой большэвіцкай страснасцю і непрымірымасцю тав. Молатаў зрываў маскі з ворагаў ленінізма! XV з'езд партыі. Трацкісцка-зіноўеўская банда ўсімі сіламі скрывае сваю здрадніцкую сутнасць. Раздаецца чэканны голас Молатава. Ён гаворыць:

«...Ідэйная сутнасць апазіцыі, гэта—поўная капітуляцыя перад буржуазнай ідэалогіяй...» (**Сталін:** «Правільна!»).

Молатаў працягвае:

«...Мы перамаглі ў свой час дробнабуржуазныя партыі эсэраў і меншавікоў; цяпер мы перамагаем мізэрныя астаткі дробнабуржуазных палітычных настрояў, якія спрабавалі ўгняздзіцца ў нашай партыі. Гэта неабходна для расчысткі далейшых шляхоў і для ажыццяўлення яшчэ больш важных і сапраўды карэнных задач будаўніцтва соцыялізма».

З такой-жа страснасцю, жалезнай логікай, перакананасцю тав. Молатаў выкрываў і бухарынска-рыкаўскіх здраднікаў і прадажнікаў.

Усё жыццё тав. Молатава — увасабленне большэвіцкай рэволюцыйнай пільнасці, непрымірымасці да ворагаў, вернасці вялікаму вучэнню Леніна—Сталіна. Гэтаму-ж тав. Молатаў вучыць усіх партыйных і непартыйных большэвікоў.

«У радах нашай партыі, — гаворыць тав. Молатаў, — няма і не можа быць чалавека, які не разумеў-бы, што толькі на аснове **правядзення ў жыццё ленінскага вучэння,** на аснове ажыццяўлення ленінскай палітыкі партыя дабілася найвялікшых перамог: у паслядоўным правядзенні ў жыццё ленінскага вучэння на практыцы, — найвялікшая заслуга нашага Цэнтральнага Камітэта на чале з верным прадаўжальнікам ленінскай справы **таварышам Сталіным».**

На пасту сакратара ЦК тав. Молатаў з асаблівай глыбінёй распрацоўваў пытанні работы партыі ў вёсцы, пытанні ўмацавання саюза рабочых і сялян. На XV з'ездзе партыі, на якім таварыш Сталін праўзгаласіў курс на калектывізацыю сельскай гаспадаркі, даклад аб вёсцы рабіў тав. Молатаў. Ён сказаў:

«Ужо калі гаварыць аб лозунгу сучаснага моманту, то гэтым лозунгам з'яўляецца: **вёска, уперад — да буйнай калектыўнай гаспадаркі! Вось лозунг цяперашняга моманту».**

Большэвіцкай партыйнасцю пранізана ўся 35-гадовая барацьба тав. Молатава за справу рабочага класа. Калі ў канцы 1930 года тав. Молатаў быў назначан на высокі пост главы совецкага ўрада, ён перад тварам усёй партыі заявіў: «...На работу ў Соўнарком я іду ў якасці партыйнага работніка, у якасці правадніка волі партыі і яе Цэнтральнага Камітэта».

Партыя ведае тав. Молатава як буйнейшага партыйнага і дзяржаўнага дзеяча. Ён адкрывае нашы партыйныя з'езды; яго голас гучыць з зала Вярхоўнага Совета СССР і з трыбуны Краснай Плошчы; ён выдатны партыйны літаратар і буйнейшы тэарэтычны работнік партыі; ён выступае з важнейшымі дакладамі, якія мабілізуюць народ на ажыццяўленне сталінскай палітыкі краіны соцыялізма.

Аўтарытэт тав. Молатава, бліжэйшага саратніка вялікага Сталіна, непарушны. Любоў, давер'е, павага да яго выключна вялікія. Гэтымі пачуццямі перапоўнены большэвікі, — партыйныя і непартыйныя, мільёны совецкіх людзей, якія ад усёй душы жадаюць таварышу Молатаву яшчэ многа, многа год жыцця на дабро совецкага народа, на шчасце ўсяго працоўнага чалавецтва, якое пад сцягам Леніна — Сталіна прыдзе да перамогі комунізма ва ўсім свеце.

Н. МОР.

Таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў.

В. М. МОЛАТАЎ — КІРАЎНІК ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ СССР

На адказным пасту старшыні Совета Народных Камісараў СССР тав. Молатаў ужо дзесяты год кіруе ўрадам соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян. Ён укладае ў сваю работу ўсю большэвіцкую прынцыпіяльнасць, кіпучую творчую энергію і любоў к народу, увесь свой многагадовы партыйна-арганізатарскі вопыт.

Поспехі ўнутранай палітыкі цесна звязаны з знешняй палітыкай Совецкага Саюза. Умовы існавання соцыялістычнай дзяржавы пры капіталістычным акружэнні вельмі складаныя. Як вядома, у 1939 годзе міжнародная абстаноўка асабліва ўскладнілася. Капіталістычны свет патрасла ваенная ліхаманка. На XVIII з'ездзе партыі таварыш Сталін даў глыбокі аналіз міжнароднага становішча і выкрыў цёмныя махінацыі імперыялістаў Англіі і Францыі, іх «падзавроны шум», які меў мэтай вызваць ваенную сутычку паміж Германіяй і Совецкім Саюзам. У гэты складаны момант патрэбен быў такі кіраўнік знешняй палітыкі Совецкага Саюза, які мог-бы цвёрда праводзіць ленінска-сталінскую палітыку міру, такую самастойную знешнюю палітыку, якая ўзмацняла-б удзельную вагу і значэнне Совецкага Саюза на міжнароднай арэне.

3 мая 1939 года В. М. Молатаў быў назначан Народным Камісарам замежных спраў СССР. У цвёрдых, большэвіцкіх руках тав. Молатава практычнае правядзенне ўказанняў таварыша Сталіна па пытаннях знешняй палітыкі азнаменавалася радам буйнейшых поспехаў, маючых гістарычнае значэнне.

Адпраўным пунктам пры гэтым з'яўляюцца ўказанні таварыша Сталіна аб неабходнасці ўмацавання дзелавых сувязей з усімі краінамі, не парушаючымі інтарэсы нашай радзімы; аб устанаўленні мірных, блізкіх і добрасуседскіх адносін з суседнімі краінамі; аб падтрыманні народаў, якія сталі ахвярамі агрэсіі; аб баявой гатоўнасці краіны соцыялізма адказаць двайным ударам на ўдар падпальшчыкаў вайны.

У адпаведнасці з гэтым 19 жніўня 1939 года паміж Германіяй і СССР было заключана ў Берліне гандлёва-крэдытнае пагадненне. 23 жніўня быў заключан дагавор аб ненападзе; 28 верасня быў заключан з Германіяй пакт аб дружбе і граніцы ўзаемных дзяржаўных інтарэсаў на тэрыторыі былой польскай дзяржавы; 11 лютага гэтага года заключана гаспадарчае пагадненне, якое прадстаўляе вялікія эканамічныя выгады для абодвух дзяржаў.

Усе гэтыя дагаворы паміж СССР і Германіяй, устанаўленне прыязных палітычных і гаспадарчых узаемаадносін паміж двума такімі моцнымі дзяржавамі прадстаўляюць факт велізарнага гістарычнага значэння і з'яўляюцца «паваротным пунктам у гісторыі Еўропы, ды і не толькі Еўропы» (Молатаў).

Устанаўленне такога роду адносін з Германіяй азначае правал ваенных і імперыялістычных авантур англа-французскага блока супроць СССР. Створана моцная аснова для далейшых дзелавых сувязей такіх двух дзяржаў, роля і значэнне якіх на міжнароднай арэне выключна вялікая. Усё гэта служыць справе палітыкі міру і адпавядае інтарэсам не толькі совецкага і германскага народаў, але і карэнным інтарэсам народаў усяго свету.

Совецкі Саюз, абапіраючыся на магутнасць Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, вызваліў сваіх адзінакроўных братоў — 13 мільёнаў украінцаў і беларусаў, — таміўшыхся пад ігам польскай шляхты. Капіталістычнаму свету прышлося пацясніцца за лік Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Уродлівае стварэнне версальскай сістэмы—панская Польшча — перастала існаваць. Тым самым быў знішчан плацдарм вайны супроць СССР, які спакваля рыхтавалі англійскія і французскія імперыялісты. Сарваліся і на гэты раз планы Лондана і Парыжа вызваць ваенны канфлікт паміж Германіяй і СССР!

У мэтах умацавання безапаснасці нашых паўночна-заходніх граніц з боку Балтыйскага мора і ўстанаўлення прыязных, добрасуседскіх адносін з прыбалтыйскімі краінамі заключаны дагаворы аб узаемадапамозе з Латвіяй, Эстоніяй і Літвой.

Совецкі ўрад вялікадушна перадаў Вільна і Віленскую вобласць Літве, г. зн. вярнуў ёй тое, што калісьці гвалтоўна было ў яе ўзята польскімі панамі.

Паслядоўна прадаўжаючы палітыку агараджэння безапаснасці сваіх прыбалтыйскіх граніц, Совецкі Саюз прапанаваў заключыць падобны-ж дагавор Фінляндыі. Але каты фінскага народа — манергеймы, танеры, каяндэры і іншыя — адверглі нашу прапанову. Яны палічылі за лепшае ісці па здрадніцкаму шляху зладзейскай падрыхтоўкі інтэрвенцыі супроць СССР, яны рашылі выслужыцца перад падпальшчыкамі вайны — англійскім імперыялізмам. Чырвоная Армія, па заданню свайго ўрада, выступіла супроць зарваўшайся фінскай белагвардзейшчыны, каб абараніць паўночна-заходнія граніцы краіны, адвесці пагрозу ад Ленінграда, знішчыць плацдарм вайны, які падрыхтоўваўся англа-французскім імперыялізмам супроць СССР.

Як толькі ўтварыўся новы Народны ўрад дэмакратычнай Фінляндыі на чале з Куусіненам, Совецкі Саюз заключыў з ім пакт аб дружбе і ўзаемадапамозе. Чырвоная Армія вызваляе фінскі народ ад халопаў замежнага імперыялізма.

У студзені гэтага года заключан дагавор аб гандлі і мораплаванні з Балгарыяй. Прыязныя адносіны і гаспадарчая сувязь паміж Балгарыяй і СССР будуць толькі на карысць народам абодвух дзяржаў.

Значна палепшаны палітычныя і гаспадарчыя адносіны з Японіяй.

За некалькі месяцаў кіраўніцтва знешняй палітыкай тав. Молатавым зроблена тое, што па свайму значэнню і выніках роўна годам. У велізарнай ступені вырасла міжнароднае значэнне і ўплыў краіны перамогшага соцыялізма.

Цвёрда выконваючы ўказанні таварыша Сталіна, слаўны кіраўнік знешняй палітыкі соцыялістычнай дзяржавы тав. В. М. Молатаў нястомна дабіваецца поспехаў як ва ўнутранай, так і ў знешняй палітыцы СССР.

В. Кружкоў.

ГЛАВА СОВЕЦКАГА ЎРАДА

Ішоў трэці год першай сталінскай пяцігодкі. Іменна ў гэтым, 1930 годзе, вырашалася пытанне аб тым, ці быць першай пяцігодцы выкананай у чатыры годы. Народная гаспадарка краіны крута паднімалася ўгору. Крэпла цяжкая прамысловасць. Беспрацоўе хутка змяншалася. Краіна была ахвачана пафасам грандыёзнага будаўніцтва. Вырасла новая сіла ў сельскай гаспадарцы — соўгасы і калгасы. Асноўная маса сялянства павярнула ў бок калгасаў.

Наступленне соцыялізма па ўсяму народнагаспадарчаму фронту разгортвалася пабеданосна. Але з гэтага выцякалі і асобыя труднасці — **труднасці росту.** Для перамагання гэтых труднасцей патрэбна было, перш за ўсё, адбіць атакі капіталістычных элементаў, падавіць іх супраціўленне і расчысціць, такім чынам, дарогу для хуткага прасоўвання ўперад. Для гэтага неабходна было «арганізаваць **наступленне** на капіталістычныя элементы **па ўсяму фронту** і ізаляваць апартуністычныя элементы ў нашых уласных радах, перашкаджаючыя наступленню, кідаючыяся ў паніцы з боку ў бок, і ўносячыя ў партыю няўпэўненасць у перамозе».

Так гаварыў таварыш Сталін у справаздачным дакладзе ЦК ВКП(б) на XVI з'ездзе партыі ў канцы чэрвеня 1930 г.

А 19 снежня таго-ж года на пост старшыні Совета Народных Камісараў СССР быў назначан Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў.

Таварыш Молатаў, які да гэтага прабыў 10 год сакратаром ЦК і якога ўвесь народ ведаў, як вытрыманага і стойкага барацьбіта за генеральную лінію партыі, як вернага вучня Леніна, як бліжэйшага саратніка таварыша Сталіна, —таварыш Молатаў так ацаніў сваё новае назначэнне:

«Я рос у большэвіцкай партыі і звязан з ёю многімі гадамі бесперапыннай работы, — гаварыў ён у снежні 1930 года на Пленуме ЦК і ЦКК. — У мяне, як у комуніста, няма і не можа быць большага жадання, чым быць на справе вучнем Леніна. Мне нядоўга прышлося працаваць пад непасрэдным кіраўніцтвам Леніна, але для мяне, як комуніста, заўсёды было і астаецца галоўнай задачай — усваенне вучэння Маркса — Леніна і актыўны ўдзел у справе правядзення ў жыццё марксісцка - ленінскага вучэння. На працягу апошніх год мне прышлося, у якасці сакратара Цэнтральнага Камітэта, праходзіць школу большэвіцкай работы пад непасрэдным кіраўніцтвам лепшага вучня Леніна, пад непасрэдным кіраўніцтвам таварыша Сталіна. Я ганаруся гэтым.

Да гэтага часу мне прыходзілася працаваць галоўным чынам у якасці партыйнага работніка. Заяўляю вам, таварышы, і на работу ў Соўнарком я іду ў якасці партыйнага работніка, у якасці праваднiка волі партыі і яе Цэнтральнага Камітэта». (**В. Молатаў,** «У барацьбе за соцыялізм», Партвыдат, 1934 г., стар. 76).

* * *

Дзесяты год стаіць Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў на чале совецкага ўрада.

Створана соцыялістычная індустрыя, якая абагнала па тэмпах развіцця і тэхніцы вытворчасці галоўнейшыя капіталістычныя краіны. Вырасла новая, калгасная, заможная вёска з самай буйнай у свеце перадавой сельскай гаспадаркай. Расцвіла культура народаў СССР, навука, літаратура, мастацтва. Выраслі людзі, кадры свядомых будаўнікоў комуністычнага грамадства. Нерушыма дружба народаў СССР. Узнікла нябачанае ў свеце маральна-палітычнае адзінства совецкага народа.

Арганізатарам, натхніцелем усіх гэтых перамог быў наш вялікі настаўнік і правадыр таварыш Сталін. Па яго непасрэдных указаннях састаўляліся тры пяцігодкі, якія ператварылі нашу радзіму ў непрыступную магутнейшую дзяржаву соцыялізма. Бліжэйшым саратнікам таварыша Сталіна ў пабудове велічнага будынка соцыялістычнага грамадства быў слаўны кіраўнік совецкага ўрада Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў.

Прамовы, даклады і артыкулы таварыша Молатава вызначаюцца глыбінёй аналіза, багаццем зместу, яснай, строга прадуманай пастаноўкай пытанняў, яркімі супастаўленнямі і абагульненнямі.

Вось таварыш Молатаў на трыбуне XVIII з'езда партыі. Ён выступае з грунтоўным дакладам аб трэцім пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР. Ён падводзіць бліскучыя вынікі другой пяцігодкі. Сіла наша ў тым,— гаворыць таварыш Молатаў, — што ў Совецкім Саюзе ва ўсім задаюць тон перадавыя людзі нашага народа. Гэтыя людзі— свядомыя комуністы, непартыйныя большэвікі, стаханаўцы, калгасныя перадавікі, соцыялістычная інтэлігенцыя. Вось тварцы новага жыцця!

Але тут-жа таварыш Молатаў перасцерагае ад зазнайства: «Ці значыць гэта, што ўжо ўсе рабочыя і ўсе сяляне сталі перадавымі людзьмі нашага грамадства? Не, яшчэ не значыць.

І сярод рабочых ёсць перадавыя і ёсць адсталыя, не гаворачы ўжо аб уродах. Таксама і сярод сялян: ёсць і перадавыя, ёсць і адсталыя. Ёсць, безумоўна, і горш, чым проста адсталыя. Перадавыя людзі нашага часу з'яўляюцца актыўнымі і самааддадзенымі будаўнікамі комунізма, лепшымі барацьбітамі за ўмацаванне нашай дзяржавы. За гэтымі перадавымі людзьмі нашага грамадства ўжо свядома ідзе падаўляючая маса рабочых і сялян. Але і сярод рабочых, не гаворачы ўжо аб служачых, вельмі жывучы дробнабуржуазныя прывычкі. Яшчэ нямала такіх, якія гатовы ўрваць для сябе ў дзяржавы пабольш, а там хоць трава не расці».

І таварыш Молатаў заклікае да рашучай барацьбы за інтарэсы дзяржавы, за ўмацаванне працоўнай дысцыпліны на нашых прадпрыемствах і ва ўстановах.

* * *

Уся дзейнасць таварыша Молатава, як главы совецкага ўрада, пранікнута глыбокай партыйнасцю. Ён сапраўды з'яўляецца праваднiком волі партыі ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва. Непераможную сілу прынцыпаў совецкай дзяржавы, совецкай дэмакратыі таварыш Молатаў бачыць у жывой, блізкай сувязі партыі Леніна—Сталіна з масамі працоўных.

У яркіх, хвалюючых словах выразіў гэту думку таварыш Молатаў у сваім дакладзе да XX-годдзя Кастрычніцкай рэволюцыі. У нашай краіне, гаварыў тав. Молатаў у гэтым дакладзе, усё сапраўды соцыялістычнае становіцца народным, блізкім народным масам:

«У нас стала прывычным, што ворагаў комуністычнай партыі і совецкай улады лічаць ворагамі народа...

Гэта азначае, што ў нашай краіне стварылася нябачанае раней унутранае **маральнае і палітычнае адзінства народа,** маральнае і палітычнае адзінства соцыялістычнага грамадства.

Такога адзінства народа не ведала і не ведае ні адна капіталістычная краіна...

Маральна-палітычнае адзінства народа ў нашай краіне мае і сваё жывое ўвасабленне. У нас ёсць імя, якое стала сімвалам перамог соцыялізма. Гэта імя разам з тым сімвал маральнага і палітычнага адзінства совецкага народа. Вы знаеце, што гэта імя—Сталін!».

* * *

Уся дзейнасць таварыша Молатава, як главы совецкага ўрада, пранікнута глыбокім патрыятызмам, гордасцю за наш народ, за поспехі соцыялістычнай культуры ў нашай краіне. Патрыятызм таварыша Молатава спалучаецца з глыбокім пачуццём інтэрнацыяналізма, міжнароднай салідарнасці працоўных. Спачуванне міжнароднага пролетарыята нашай справе, разуменне ім шляхоў, якімі мы прышлі да перамогі і ідзем няўхільна ўперад, да комунізма, — гэта найвялікшая сіла, —гаворыць тав. Молатаў.

Дзяржава працоўных павінна быць крэпасцю непрыступнай, неўязвімай. Таварыш Молатаў, як глава совецкага ўрада, многа займаецца пытаннямі ўмацавання абароны СССР. Разам з таварышам Сталіным ён праяўляе выключныя клопаты аб росце ўзброеных сіл соцыялізма, аб лепшым тэхнічным аснашчэнні нашай доблеснай Чырвонай Арміі, растучага Ваенна-Марскога Флота, нашай слаўнай авіяцыі.

СССР жыве ў капіталістычным акружэнні. «Мы не можам ведаць, з якімі знешнімі выпрабаваннямі нам яшчэ прыдзецца сустрэцца. Але адно мы добра ведаем: трэба не паслабляць, а яшчэ больш, яшчэ настойлівей мацаваць магутнасць абароны нашай дзяржавы», — сказаў таварыш Молатаў у даклазе к XXII гадавіне Кастрычніцкай рэволюцыі. На першай сесіі Вярхоўнага Совета СССР таварыш Молатаў ярка абгрунтаваў неабходнасць стварэння новага Наркамата — Ваенна-Марскога Флота. Нам патрэбна сільная Чырвоная Армія, і нам патрэбен сільны Ваенна-Марскі Флот. «У магутнай совецкай дзяржавы, — сказаў таварыш Молатаў, — павінен быць адпаведны яе інтарэсам, дастойны нашай вялікай справы, марскі і акіянскі флот».

Як вядома, гэты флот будуецца, ствараецца і будзе створан.

З 3 мая 1939 года таварыш Молатаў узначальвае і Народны Камісарыят Замежных Спраў СССР. Дзейнасць таварыша Молатава, як кіраўніка знешняй палітыкі СССР, неаддзяліма ад яго дзейнасці як главы Совецкага Саюза.

Тав. Молатаў паспяхова ажыццяўляе праграму знешняй палітыкі СССР, абвешчаную таварышам Сталіным на XVIII з'ездзе партыі.

У апошні час былі заключаны дагаворы аб узаемадапамозе з прыбалтыйскімі краінамі: Эстоніяй, Латвіяй і Літвой. Па гэтых дагаворах СССР атрымаў права мець свае ваенна-марскія базы і аэрадромы ў пэўных пунктах Эстоніі і Латвіі, а ў адносінах Літвы ўстанавілі сумесную з СССР абарону літоўскай граніцы. Гэтыя дагаворы стварылі надзейную апору для абароны не толькі Совецкага Саюза, але і прыбалтыйскіх дзяржаў.

Карэнны паварот адбыўся ў адносінах СССР з Германіяй. На змену варожасці, якая ўсяляк падагравалася некаторымі еўрапейскімі дзяржавамі, прышло збліжэнне і ўстанаўленне дружаскіх адносін паміж СССР і Германіяй. Заключэнне совецка-германскага дагавора аб ненападзе 23 жніўня 1939 г., а затым дагавора аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй 28 верасня 1939 г., аказалі велізарны ўплыў на ўсё міжнароднае становішча ў Еўропе. Усе гэтыя важнейшыя знешнепалітычныя акты з боку СССР падпісаны тав. Молатавым.

* * *

В. М. Молатаў карыстаецца велізарнай любоўю і глыбокай павагай совецкага народа.

У час выбараў у Вярхоўны Совет СССР кандыдатура таварыша Молатава была выстаўлена на 1192 сходах рабочых, калгаснікаў, чырвонаармейцаў, чырвонафлотцаў, інтэлігенцыі.

На сходах выбаршчыкаў Молатаўскай выбарчай акругі ў Маскве таварыш Молатаў сказаў бліскучую і глыбокую па зместу прамову. У гэтай прамове ён ускрыў карэнні блока комуністаў і беспартыйных—гэтай найвялікшай сілы, якая нямысліма ні ў адной краіне, акрамя СССР.

Совецкі народ ганарыцца сваім урадам і яго главой — мужным, цвёрдым, рашучым большэвіком, вучнем Леніна, саратнікам вялікага Сталіна — Вячэславам Міхайлавічам Молатавым.

І. Ранеўскі.



В. І. Ленін, І. В. Сталін і В. М. Молатаў у рэдакцыі «Праўды».

З малюнка мастака П. Васільева. (Фота-кліша ТАСС).

У ГАСЦЯХ У ВЯЧЭСЛАВА МІХАЙЛАВІЧА

У пачатку кастрычніка 1935 года нас з Вічугі выклікалі ў Маскву.

Гэта было ў самым пачатку стаханаўскага руху, а ў нашым тэкстыльным краі — Іванаўскай вобласці ён разгараўся сярод ткачых. Мы ў сябе, у Вічузе, толькі што паставілі новы сусветны рэкорд—перайшлі працаваць на 144 станкі.

Прыехалі ў Маскву. Спачатку нас, стаханаўцаў лёгкай прамысловасці, сабралі ў Наркамаце, была нарада. Потым нам сказалі:

— Вас кліча да сябе ў госці таварыш Молатаў. У Крэмль, у Соўнарком.

Нам стала і радасна, і боязна. Ці маглі мы калі - небудзь марыць, што нам — простым ткачыхам — давядзецца сустрэцца з главой совецкага ўрада, з бліжэйшым саратнікам вялікага Сталіна.

З гэтымі думкамі мы ўвайшлі ў Крэмль. Нас сустрэлі як жаданых гасцей.

І раптам увайшоў таварыш Молатаў. Такі просты чалавек! Страху нашага як і не было. Нас адразу пазнаёмілі. Мы і не заўважылі, як ужо ўключыліся ў агульную гутарку.

Але вось нас папрасілі расказаць аб тым, як мы дабіліся поспехаў. Мы зноў спалохаліся і гаворым:

— Мы-ж, таварыш Молатаў, не ўмеем выступаць.

А Вячэслаў Міхайлавіч сардэчна:

— Каго вы сцясняецеся? Тут усе рабочыя, усе свае людзі і сцясняцца-ж няма каго. Проста раскажыце, як вы працуеце.

Пасля гэтых слоў адчулі сябе свабодна і пачалі расказваць.

Таварыш Молатаў падрабязна распытваў аб нашых рэкордах і цікавіўся гісторыяй гэтых рэкордаў.

— Ну, вось скажыце: вы самі дадумаліся да гэтага, ці хто небудзь вам прапанаваў узяць столькі станкоў?

— Не,—гаворым, — гэта мы самі выклікаліся.

К канцу гутаркі мы настолькі звыкліся з таварышам Молатавым, гутарка наша працякала так лёгка, як быццам мы знаёмы з ім цэлую вечнасць. Ён пытаў, як мы ўстроіліся ў Маскве, ці падабаецца сталіца. У кутку зала пасяджэнняў Соўнаркома стаяла плеценае крэсла. Таварыш Молатаў (мы сядзелі побач з ім па левую руку) паказаў на яго і гаворыць:

— На гэтым крэсле сядзеў таварыш Ленін.

Мы прыціхлі, задумаліся. Думалі аб нашай шчаслівай маладосці, якую нам далі геніяльныя правадыры рабочага класа — таварышы Ленін і Сталін.

Гутарка падыходзіла к канцу. Таварыш Молатаў развітаўся з намі.

— Жадаю вам усяго добрага,—сказаў ён. — Напэўна ў бліжэйшы час сустрэнемся.

Прайшло нямнога часу. 14 лістапада ў Вялікім Крэмлёўскім палацы адкрылася вядомая нарада стаханаўцаў прамысловасці і транспарта. Нас таксама выклікалі на гэту нараду. Мы сядзелі блізка ад прэзідыума, ад таварышоў Сталіна і Молатава. Таварыш Молатаў паказаў на нас таварышу Сталіну як на старых сваіх знаёмых:

— Вось ткачыхі Вінаградавы...

Пасля нарады стаханаўцаў, калі нас узнагароджвалі ордэнамі, таварыш Молатаў падышоў да нас. Ён падрабязна распытваў, як мы працуем, як адчуваем сябе. Мы расказалі Вячэславу Міхайлавічу аб нашых справах, сказалі, што цяпер працуем на 216 станках.

Мы часта атрымліваем пісьмы ад выбаршчыкаў. Прыходзіцца звяртацца да таварыша Молатава па дэпутацкіх справах для вырашэння розных пытанняў. І заўсёды мы знаходзім у таварыша Молатава вялікую ўвагу, патрэбны адказ і неабходнае падтрыманне.

Еўдакія Вінаградава,
дэпутат Вярхоўнага Совета СССР.
Марыя Вінаградава,
дэпутат Вярхоўнага Совета РСФСР.

СОВЕЦКІЯ АКТОРЫ Ў ГЛАВЫ ЎРАДА

7 сакавіка 1935 года Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў і Клімент Ефрэмавіч Варашылаў прынялі дэлегатаў усерасійскага тэатральнага таварыства.

У склад дэлегацыі ўваходзілі народныя і заслужаныя артысты Блюменталь-Тамарына, Дзяржынская, Турчанінава, Яблачкіна, Адэльгейм, Садоўскі, Якаўлеў, Тарханаў і іншыя.

Мы расказалі таварышу Молатаву аб рабоце таварыства, аб нашых задачах і планах на будучы час. Вячэслаў Міхайлавіч падрабязна распытваў нас аб жыцці таварыства. У яго пытаннях адчуваўся вялікі інтарэс да тэатра, да яго работнікаў і, у прыватнасці, да ўмоў жыцця ветэранаў сцэны.

Мы прышлі да таварыша Молатава з просьбамі, якія, да нашай агульнай радасці, былі хутка задаволены.

Затым я запытала, ці нельга перайменаваць Таварыства ва ўсесаюзнае. Вячэслаў Міхайлавіч вельмі мякка і пераканаўча растлумачыў мне, што таварыства не павінна і не можа адкрываць самастойна свае аддзяленні ў саюзных рэспубліках.

— Вось мы, — сказаў усміхаючыся Вячэслаў Міхайлавіч, не ўмешваемся ў самаўпраўленне саюзных рэспублік. Ініцыятыва адкрыцця тэатральнага таварыства павінна ісці ад рэспублік, а вы можаце дапамагаць ім сваёй парадай, вопытам.

Парада таварыша Молатава ператворана ў жыццё. Зараз у Арменіі і Грузіі, з нашай таварыскай дапамогай, арганізуюцца свае тэатральныя таварыствы.

Гутарка не абмежавалася толькі арганізацыйнымі пытаннямі, а перайшла на творчыя, бытавыя.

Вячэслаў Міхайлавіч і Клімент Ефрэмавіч Варашылаў жыва цікавіліся тэатральным жыццём, тэатральным мастацтвам. Яны запыталі:

— Чаму так доўга не паяўляюцца на свет новыя пастаноўкі?

Тут старыкі сталі скардзіцца, што ўжо вельмі доўга зацягваюцца падрыхтоўчыя работы, і ў актораў за бясконцым сядзеннем за сталом і „пераждоўваннем" тэкста прападае натхненне. М. М. Тарханаў прывёў сябе ў прыклад: ён рэпетыруе новую ролю амаль што два гады, яшчэ не сыграў яе, а яна ўжо абрыдла: так доўга прыходзіцца яе перажоўваць.

Клімент Ефрэмавіч, жартуючы, паабяцаў, што ён, калі вызваліцца крыху ад сваёй прамой справы, падгоніць рэжысёраў і пастаноўшчыкаў.

Сярод нас былі артысты Вялікага, Малога і Мастацкага тэатраў. Размова пераходзіла з аднаго тэатра на другі. Памятаю, што К. Г. Дзержынскую Вячэслаў Міхайлавіч і Клімент Ефрэмавіч распытвалі аб пастаноўцы „Пікавай дамы".

Гутарка ішла ў такой сяброўскай, добрапажадальнай атмасферы, што не хацелася яе канчаць, і мы з трудом знайшлі ў сябе сілы адкланяцца і падзякаваць таварышоў Молатава і Варашылава за незабываемы, цёплы прыём.

Мы пайшлі акрыленыя, шчаслівыя. Мы бачылі ў гэтых вялікіх людзях сваіх сяброў. Мы, старыкі, міжвольна параўноўвалі наша мінулае і сучаснае.

Колькі энергіі, часу, настойлівасці, сіл трэба было патраціць, каб дабіцца прыёму ў дырэктара „імператарскіх" тэатраў, і як прыніжаючы быў гэты прыём! А зараз глава ўрада многанацыянальнага Совецкага Саюза, амаль неадкладна назначае прыём артыстам, з незвычайнай увагай і з поўным разуменнем патрэб тэатра і актораў выслухоўвае нас!

Як мы павінны любіць, цаніць і гардзіцца перад усім светам такім сапраўды народным урадам, як наш!

А. Яблачкіна,
народная артыстка Саюза ССР.

АПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 7 сакавіка на фронце не адбылося нічога асаблівага. На поўначы нашымі часцямі занят горад **Наутоі** ў 153 кілометрах на поўдзень ад Петсамо, а на захад ад горада Піткеранта на паўночным узбярэжжы Ладажскага возера заняты астравы: Максіман-саары, Петэя-саары, Пайміон-саары і Хонкас-саары.

Наша авіяцыя вяла актыўныя дзеянні па войсках праціўніка. Пры гэтым збіта 15 самалётаў праціўніка.

——«о»——

50-ГОДДЗЕ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ В. М. МОЛАТАВА

СХОДЫ, ГУТАРКІ, ЧЫТКІ

Працоўныя Масквы, як і ўсёй нашай бязмежнай радзімы, радасна адзначаюць 50-годдзе з дня нараджэння бліжэйшага саратніка таварыша Сталіна, главы совецкага ўрада — Вячэслава Міхайлавіча Молатава. Паўсямесна на прадпрыемствах, ва ўстановах, у воінскіх часцях і выбарчых участках, інстытутах і школах арганізуюцца гутаркі і чыткі матэрыялаў аб жыцці і рэвалюцыйнай дзейнасці таварыша Молатава.

130 агітатараў прамысловай акадэміі лёгкай індустрыі ім. Молатава правядуць у гэтыя дні гутаркі аб таварышу Молатаве на былых выбарчых участках.

74.600.000 ЭКЗЕМПЛЯРАЎ ТВОРАЎ В. М. МОЛАТАВА

Творы В. М. Молатава шырока распаўсюджаны ў Совецкім Саюзе. Па даных Усесаюзнай кніжнай палаты, артыкулы, даклады і прамовы В. М. Молатава выданы ў СССР з 1917 г. па 15 лютага 1940 года агульным тыражом у 74.600 тысяч экземпляраў.

Творы В. М. Молатава выданы ў СССР па 74 мовах. Яны вышлі ў свет на многіх замежных мовах: нямецкай, англійскай, балгарскай, кітайскай, іспанскай, латышскай, літоўскай, французскай, эстонскай, японскай і інш.

ЗБОРНІК «РЭВОЛЮЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ В. М. МОЛАТАВА Ў ЛЕНІНГРАДЗЕ»

Да 50-годдзя з дня нараджэння Вячэслава Міхайлавіча Молатава Ленінградскі інстытут гісторыі партыі выпушчае зборнік „Рэвалюцыйная дзейнасць В.М. Молатава ў Ленінградзе“.

У зборніку апісваецца падпольная рэвалюцыйная дзейнасць студэнта палітэхнічнага інстытута Вячэслава Скрабіна, работа ў створанай ім большэвіцкай студэнцкай арганізацыі, у рэдакцыі большэвіцкай „Праўды“, у прафсаюзах, расказваецца аб прыездзе таварыша Молатава ў Петраград у канцы 1916 года пасля ўцякання з ссылкі, аб яго рабоце ў Расійскім бюро ЦК большэвікоў, затым аб дзейнасці ў дні Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У заключэнні кнігі апісваецца прыезд у Ленінград таварыша Молатава разам з іншымі членамі ЦК ВКП(б) для разгрому трацкісцка-зіноўеўскай апазіцыі, яго выступленні на заводах і надзвычайных партыйных канферэнцыях.

ВЫСТАЎКА, ПРЫСВЕЧАНАЯ 50-ГОДДЗЮ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ В. М. МОЛАТАВА

Бібліятэка Акадэміі навук УССР адкрыла выстаўку, прысвечаную 50-годдзю з дня нараджэння Вячэслава Міхайлавіча Молатава.

ЛЕДАКОЛ «В. М. МОЛОТОВ»

На Ленінградскім суднабудаўнічым заводзе імені Орджанікідзе будуецца новы магутны ледакол „В. М. Молотов“.

Вадазмяшчэнне ледакола 11.000 тон. Магутнасць яго трох паравых машын 10 тысяч конскіх сіл. Гэта карабль-гігант, яго вышыня 12 метраў, шырыня 23 і даўжыня 106 метраў. Па сваёй канструкцыі ён такі-ж самы, як флагман арктычнага флота ледакол „Сталін“.

Па-стаханаўску, з вялікай любоўю будуюць балтыйцы новы ледакол. Яны імкнуцца, каб іх дзецішча апраўдала прысвоенае яму імя.

(ТАСС).

ТЭЛЕГРАМЫ

Нарвежскія рабочыя супроць падпальшчыкаў вайны

Осло, 8 сакавіка. (ТАСС). Днямі паведамлялася, што рэакцыйнае кіраўніцтва бергенскай соцыял-дэмакратычнай арганізацыі выключыла з партыі ўсіх членаў саюза электраманцёраў горада Бергена, выступіўшых супроць правакацыйнай палітыкі агентаў англа-французскіх падпальшчыкаў вайны, накіраванай на ўцягненне Нарвегіі ў вайну. Давेдаўшыся аб гэтым рашэнні лідэраў нарвежскай соцыял-дэмакратыі, бергенскія электраманцёры на сваім агульным сходзе прынялі аднадушна рашэнне аб выхадзе ўсіх членаў саюза электраманцёраў з нарвежскай соцыял-дэмакратычнай партыі. Сабраўшыяся яшчэ раз пацвердзілі прынятую на мінулым сходзе рэзалюцыю аб адмове ад дапамогі белафінам і заклеймілі дзейнасць нарвежскай рэакцыі ў гэтым кірунку, як здраду і прадажніцтва інтарэсаў краіны.

Нарвежская газета „Арбейдэрэн“ паведамлае, што будаўнічыя рабочыя гарадоў Арэндаля і Молдэ адхілілі прапанову лідэраў аб'еднання нарвежскіх профсаюзаў аб зборы сродкаў на карысць белафінаў. У сваёй рэзалюцыі рабочыя-будаўнікі горада Молдэ заявілі: „Мы катэгарычна пратэстуем супроць збораў сродкаў для манергеймаўскай Фінляндыі. Нарвежскі народ не хоча вайны. Мы патрабуем прыняць усе меры да таго, каб Нарвегія не была ўцягнута ў вайну“.

ХВАЛЯВАННІ Ў ПАЛЕСТЫНЕ

Нью-Иорк, 8 сакавіка. (ТАСС). Нядаўна англійскія ўлады ў Палестыне ўвялі рад абмежаванняў для яўрэяў, пазбавілі іх права купляць зямлю нароўні з другімі. Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс з Іерусаліма, у час адбыўшыхся нядаўна дэманстрацый яўрэяў супроць увядзення гэтых абмежаванняў адбыліся сутычкі з паліцыяй. У рэзультаце сутычкі два чалавекі забіты і 300 ранены (у тым ліку 12 англічан). Агенцтва адзначае, што антыанглійскія дэманстрацыі адбыліся ў Іерусаліме, Хайфе і Тэль-Авіве.

У Тэль-Авіве ў дэманстрацыі ўдзельнічала звыш 15.000 яўрэяў. На галоўнай вуліцы горада былі зроблены барыкады. Паліцыя не ў сілах была рассеяць дэманстрантаў. Былі вызваны кавалерыйскія часці, якія пусцілі ў ход шаблі. Сярод дэманстрантаў налічваецца 140 раненых. Маюцца раненыя таксама сярод паліцэйскіх. У Іерусаліме налічваецца 45 раненых дэманстрантаў і 16 паліцэйскіх. У Хайфе паліцыя рассеяла дэманстрантаў, якія імкнуліся падпаліць будынак суда. Сярод дэманстрантаў налічваецца 90 раненых. Амерыканскі друк прыводзіць рад паведамленняў аб тым, што ў ЗША расце хваля пратэсту супроць англійскай палітыкі ў Палестыне.

Становішча фермераў у ЗША

Нью Иорк, 7 сакавіка (ТАСС). Становішча фермераў у многіх штатах ЗША ўсё пагаршаецца. У сувязі з механізацыяй сельскагаспадарчых работ і радам іншых прычын, бесперапынна расце колькасць арандатараў і беззямельных фермераў, становішча якіх робіцца роспачным.

Па апошніх даных у краіне — каля 350 тысяч пазбаўленых прытулку, вандруючых фермераў, якія налічваюць разам з сем'ямі звыш аднаго мільёна чалавек. Яны вандруюць па краіне ў старых аўтамабілях, шукаюць усюды работы. Гэтыя людзі размяшчаюцца лагерамі ў баку ад аўтамабільных дарог. Жывуць у антысанітарных умовах, ужываючы непрыгодную для піцця ваду. Іх дзеці не могуць вучыцца. У сувязі з хранічным недаяданнем сярод фермераў распаўсюджаны розныя хваробы.

За апошнія годы павялічыўся таксама пераход фермерскіх гаспадарак ва ўласнасць буйных страхавых кампаній і банкаў. На працягу аднаго года колькасць ферм, якія перайшлі ва ўласнасць банкаў і страхавых кампаній, павялічылася з 88 мільёнаў долараў да 600 мільёнаў.

На здымку: Група вучняў г. Беластока—ўдзельнікаў гарадскога лыжнага спаборніцтва, прысвечанага выбарам. (Фота Сапір).

На ўрачыстым сходзе, прысвечаным 8-му сакавіка

7 сакавіка ў Беластоцкім гарадскім тэатры адбылося ўрачыстае пасяджэнне партыйнага, профсаюзнага і совецкага актыва, прысвечанае святкаванню Міжнароднага комуністычнага жаночага дня.

Ад імені Беластоцкага гаркома КП(б)Б і горвыканкома ўрачыстае пасяджэнне адкрывае сакратар гаркома партыі тав. Тупіцын.

З цікавым дакладам аб Міжнародным жаночым комуністычным дні выступіла тав. Новікава. Дакладчыца падрабязна спынілася на пройдзеным совецкай жанчынай шляху пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Затым выступае тав. Сельм, якая расказвае аб цяжкім мінулым працоўнай жанчыны ў былой панскай Польшчы.

З змястоўнай прамовай выступае былая работніца - тэкстыльшчыца, а цяпер дырэктар 25 тэкстыльнай фабрыкі тав. Каплан.

— Буржуазія капіталістычных краін, — гаворыць тав. Каплан, — заўсёды старалася трымаць у цемры жанчыну - работніцу. Але гэта ёй не заўсёды ўдавалася. Работніцы прымалі актыўны ўдзел у барацьбе за свабоднае жыццё. Асабліва паказалі сябе ў былой Польшчы тэкстыльшчыцы Беластока.

З цёплай, сардэчнай прамовай выступіла работніца - тэкстыльшчыца тав. Раманоўская. Яна расказала, як змянілася доля працоўнай жанчыны ў заходніх абласцях Беларусі пасля прыходу гераічнай Чырвонай Арміі.

— Я ўжо 20 год працую на фабрыцы, — гаворыць тав. Раманоўская. — Працавала я з цёмнага да цёмнага, а дзеці раслі безнаглядньмі. У школах былой польскай дзяржавы для іх не знаходзілася месца. Цяпер мае дзеці ходзяць у совецкую школу. Я ведаю, што іх будучыня поўнасцю забяспечана. Ці ёсць дзе-небудзь такая краіна на свеце, дзе дзецям працоўных не толькі прадастаўлена магчымасць вучыцца, але дзе яны таксама атрымліваюць стыпендыю за тое, што яны вучыцца? Нідзе гэта немагчыма, акрамя вялікай совецкай краіны. Але нашы дасягненні трэба ўмацаваць і пашырыць, і таму я абяцаю ад імені жанчын - работніц, што яны ўсе як адна 24 сакавіка аддадуць свае галасы за лепшых сыноў нашай свабоднай радзімы.

Пад гром апладысментаў прымаецца прывітальнае пісьмо таварышу Сталіну. Пасля ўрачыстага пасяджэння была паказана п'еса «Любоў Яравая».

В. Бемаў.

Совецкі пашпарт

Пачалася пашпартызацыя населеных пунктаў Беластоцкай вобласці. На пашпартным пункце № 1 па вуліцы Чырвонаармейскай у доме № 6 першым атрымаў совецкі пашпарт жыхар горада Беластока Іосіф Карповіч.

Карповічу зараз 66 год. Ён з гордасцю паказвае сваю новенькую пашпартную кніжку і з радасным хваляваннем расказвае аб сваім жыццёвым шляху. Яго бацька быў ткачом на тэкстыльнай фабрыцы ў Васількове. Там-жа працавала ў якасці снавальшчыцы яго маці. Сам ён 10-гадовым хлопчыкам пачаў працаваць на тэкстыльнай фабрыцы. Потым разам з сям'ёй ён пераехаў у Беласток і таксама паступіў на фабрыку; доўгі час працаваў на падсобных работах, а потым толькі ткачом.

— Цяжка мне жылося ў былой Польшчы. У 1936 годзе польскі ахраннік выпадкова заўважыў у мяне совецкі журнал на англійскай мове з партрэтам таварыша Сталіна. У той-жа вечар у мяне зрабілі вобыск, але паліцэйскія не знайшлі ўжо гэтага журнала: я яго загадзя здаў у яўрэйскую бібліятэку імені Шолам - Алейхема, дзе ён захоўваецца да сёнешняга дня. Мяне тады арыштавалі, пратрымалі некалькі дзён у паліцэйскім участку і жорстка збілі.

Я чалавек ужо стары, але я адчуваю сябе нібы памаладзеўшым. Часам здаецца, што гэта маленькая кніжачка як-бы пару дзесяткаў год страсанула з маіх плеч.

Жадаючы павысіць сваю кваліфікацыю, каб як найлепш служыць свабоднай радзіме, я паступіў цяпер на педагагічныя курсы. Кончу іх і атрымаю званне настаўніка сярэдняй школы.

Дзень 5 сакавіка 1940 года, — заканчвае тав. Карповіч, — у які совецкая ўлада выдала мне совецкі пашпарт, гэта яркі дзень у маім жыцці.

Прыезд брыгады совецкіх пісьменнікаў

У Беласток прыехала для ўдзелу ў выбарчай кампаніі брыгада совецкіх пісьменнікаў гор. Мінска ў складзе паэта - ордэнаносца П. Глебкі, драматурга В. Вольскага і пісьменніка А. Якімовіча.

6 сакавіка адбыўся агульны сход пісьменнікаў горада Беластока, на якім П. Глебка зрабіў даклад аб вопыце работы совецкіх пісьменнікаў гор. Мінска па выбарах у Вярхоўныя органы Совецкага Саюза.

Пасля абмену думкамі была выпрацавана праграма канкрэтных мерапрыемстваў па ўдзелу пісьменнікаў гор. Беластока ў перадвыбарчай кампаніі.

10 сакавіка ў доме партасветы адбудзецца агульнагарадскі літаратурны вечар, прысвечаны выбарам. На вечары прымуць удзел артысты БДТ-2.

РАСЦЕ СЕТКА ГРАМАДСКАГА ХАРЧАВАННЯ

Расце колькасць гарадскіх сталовых у Беластоку. Зараз адкрыта ўжо 6 сталовых, дзве закусачныя і адзін рэстаран, якія выдаюць разам 3000 страў у дзень.

Акрамя таго арганізавана 17 школьных буфетаў. У бліжэйшы час у кожнай школе будзе створан буфет для абслугоўвання дзяцей.

Зараз адкрываецца самы вялікі рэстаран у памяшканні былога кафе «Люкс». Новы рэстаран разлічан на 300 месц і будзе выдаваць 2500 страў у дзень.

АБЛАСНАЯ НАРАДА СЯЛЯН

15 сакавіка аблвыканком склікае нараду сялян Беластоцкай вобласці. У нарадзе прымуць удзел 280 батракоў, беднякоў і серадцякоў.

Нарада абмяркуе мерапрыемствы па падрыхтоўцы і правядзенню вясенняй сяўбы ў вобласці.

Для папулярызацыі сярод сялян рашэнняў абласной нарады і арганізацыі работы па паспяховай падрыхтоўцы да вясенняй сяўбы, пасля абласной нарады будуць праведзены раённыя нарады, нарады ў сельсоветах і агульныя сходы сялян у вёсках з пытаннем аб арганізацыі соцыялістычнага спаборніцтва паміж сельсоветамі і вёскамі на паспяховае і добраякаснае правядзенне сяўбы і атрыманне высокага ўраджаю ў 1940 годзе.

АБЛАСНАЯ АЛІМПІЯДА МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Для выяўлення народных талентаў, паднящця ідэйнага ўзроўню мастацкай самадзейнасці і адбору лепшых сіл для ўдзелу ў дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве, з 10 па 20 сакавіка адбудуцца ў Беластоцкай вобласці раённыя алімпіяды мастацкай самадзейнасці.

Лепшыя калектывы і асобныя выканаўцы самадзейнасці будуць пасланы на абласную алімпіяду, якая адбудзецца з 27 па 31 сакавіка.

Алімпіяда будзе праведзена пад лозунгам: «перамога з'еднанага беларускага народа пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі».

ПАСТАНОВА

Беластоцкага гарадскога выканаўчага камітэта

ад 7 сакавіка 1940 г.

Па існуючых у горвыканкоме даных устаноўлена, што за апошні час ёсць рад выпадкаў заняцця складскіх памяшканняў пад жылыя і пераабсталяванне і заняцце жыллёвых памяшканняў пад складскія, што ў далейшым ні ў якой меры недапушчальна.

Выходзячы з гэтага і ў мэтах недапушчэння ў далейшым падобных з'яў, Беластоцкі горвыканком пастанаўляе:

1. Абавязаць комунальны аддзел (тав. Розіка) ў дэкадны тэрмін выявіць усе выпадкі падобнага пераабсталявання і па кожнаму факту ўнесці свае прапановы.

2. Каб у далейшым падобныя факты не паўтараліся, горвыканком катэгарычна забараняе без ведама і санкцыі горвыканкома ўсякае заняцце і пераабсталяванне жыллёвых памяшканняў пад складскія і складскія пад жыллёвыя.

3. Кантроль і назіранне за правядзеннем у жыццё гэтай пастановы ўскласці на гаркамгас і органы міліцыі.

4. Асобы, узначальваючыя арганізацыі і ўстановы, у выпадку парушэння імі данай пастановы будуць падвергнуты строгай адміністрацыйнай адказнасці.

5. Ордэры, якія выданы на памяшканні, у выпадку самавольнага пераабсталявання гэтых памяшканняў лічацца аўтаматычнаануляванымі.

Старшыня Беластоцкага гарадскога выканкома
ГАРЭЛІК

Адказны сакратар Беластоцкага гарадскога выканкома
ОКУНЬ

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

1-я дзяржаўная друкарня у г. Беластоку.

Упаўнаважаны абліта № 303.